**Пашковіч А.І.** (Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна)

# ДАПАМОГА САВЕЦКІХ РЭСПУБЛІК НАСЕЛЬНІЦТВУ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 20–30 гг. ХХ ст.

Дапамога савецкіх рэспублік, перш за ўсё БССР, насельніцтву Заходняй Беларусі у міжваенны час адбывалася пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі. У 1927–1928 гг. праходзіла акцыя дапамогі галадаючым Віленшчыны. У польскіх афіцыйных сродках інфармацыі прычынамі голаду называліся неўраджай, суровая зіма, а таксама позняя і сырая вясна, якая выклікала недахоп кармоў для скаціны. Згодна афіцыйным дадзеным у маі 1929 г. неадкладнай дапамагі патрабавалі 132 285 чалавек [5, л. 2].

У красавіку 1927 г. сакратар ЦК КП(б)Б Крыніцкі напісаў пісьмо ў ЦК ВКП(б)Б, у якім звярнуўся да Сталіна з прапановай аб стварэнні ў БССР *Камітэта дапамогі пацярпелым ад неўраджаю ў Заходняй Беларусі.* На той момант на тэрыторыі БССР ужо праходзіла кампанія па збору збожжа і грошаў на дапамогу насельніцтву Заходняй Беларусі, у выніку якой было сабрана 1 000 пудоў хлеба і 46 000 руб., з якіх 23 000 руб. прызначалася пацярпелым ад неўраджая, а 23 000 руб. перадаваліся МОПР на дапамогу палітзняволеным і іх сем'ям [10, л. 114]. Стварэнне Камітэта павінна было «узмацніць за мяжой, асабліва ў Польшчы, палітычнае значэнне праведзенай у БССР кампаніі» [10, л. 114]. Цікава і тое, што ў пісьме прапаноўвалася стварыць аналагічны Камітэт на тэрыторыі Заходняй Беларусі і даручыць гэта ТБШ і беларускай кааперацыі, а таксама звярнуцца да грамадскіх арганізацый Заходняй Еўропы і Амерыкі з заклікам прыйсці з дапамогай пацярпеламу ад неўраджаю насельніцтву Заходняй Беларусі [10, л. 114]. У вёсках Савецкай Беларусі на агульных сходах пачалі стварацца камісіі, у склад якіх уваходзілі прадстаўнікі Камітэтаў сялянскай узаемадапамогі і радавыя сяляне. На сходах зачытваліся даклады аб цяжкім становішчы сялян Заходняй Беларусі, якія знаходзяцца пад «уціскам польскага фашызму і паноў», збіраліся ахвяраванні па падпісных лістах [11, л. 173].

Ход кампаніі шырока асвятляўся ў друку. Аб правядзенні кампаніі дапамогі ў БССР пісалі газеты Заходняй Беларусі. «Наша воля» на першай паласе паведамляла: «Горача адгукнуліся нашы браты беларускія сяляне на тым баку гранічнай мяжы. Ва Усходняй Беларусі па ўсіх вёсках, мястэчках і месцах адбываюцца публічныя зборы дзеля дапамогі сялянству Заходняй Беларусі. І народ дае свае ахвяры ахвотна і радасна, разумеючы, што гэтая братняя помач будзе мець вялізарнае не толькі матэрыяльнае, але і маральнае значэнне» [13, с. 1].

Да канца мая 1927 г. у 85 раёнаў Савецкай Беларусі было сабрана 8 043 руб., а таксама збожжа і харчаванне. Больш за ўсіх грошай прадаставілі Горацкі раён Аршанскай акругі (1050 руб.), Крычаўскі раён Калінінскай акругі (551,56 руб.), Касцюковіцкі раён Калінінскай акругі (450 руб.). Але ў некаторых раёнах было сабрана толькі па 7–5 руб., і нават менш за 2 руб. (Стрэшынскі раён Бабруйскай акругі) [11, л. 260]. Неабходна звярнуць увагу на тое, што акцыя дапамогі Заходняй Беларусі адбывалася ў той час, калі ў БССР назіраліся праблемы з харчовым забеспячэнем насельніцтва. Сітуацыя ў БССР асабліва пагоршылася ў сярэдзіне чэрвеня 1927 г., калі ўрад вымушаны быў зацвердзіць нормы продажу хлеба, а ў некаторых акругах хлеб выдаваўся толькі па сведчанням камітэтаў сялянскай узаемадапамогі. У некаторых гарадах людзі прастаівалі ў чарзе па 2–3 дні каб атрымаць пуд хлеба. Як адзначалася ў дакладзе сакратара ЦК КП(б)Б В.Г. Кнорына аб палітычным становішчы БССР «агульны дэфіцыт на хлеба-фуражнаму балансу БССР складаў 17 млн. пудоў, з якіх жыта і пшаніцы – 11 млн. пудоў» [10, л. 270 адв.].

Дзейнасць Камітэта дапамогі пацярпелым ад неўраджаю ў Заходняй Беларусі адбывалася ў згодзе з МОПР, аб чым сведчыць рэзалюцыя ЦК МОПР БССР ад 24 мая 1927 г. з прынятымі рашэннямі, адным з якіх было пашырэнне склада Камітэта дапамогі Заходняй Беларусі шляхам далучэння да яго работы прадстаўнікоў нізавых мопраўскіх арганізацый, жаночых камітэтаў, радавых рабочых, працоўнай інтэлігенцыі, а таксама падкрэслівалася, што «Камітэт павінен быць дапаможным грамадскім органам для ЦК МОПР Беларусі, знешне захоўваючы самастойнасць у сваёй дзейнасці» [12, л. 8].

Збор сродкаў на карысць галадаючым Віленшчыны спалучаўся з акцыяй дапамогі палітзняволеным у рамках шырокай міжнароднай кампаніі супраць белага тэрору і разгрому рабоча-сялянскіх арганізацый у Польшчы і Заходняй Беларусі. Усяго насельніцтвам Савецкай Беларусі падчас кампаніі было сабрана 68 тысяч рублёў [9, с. 55]. Галоўным арганізатарам правядзення гэтай кампаніі была *Міжнародная арганізацыя дапамогі барацьбітам рэвалюцыі* (МОПР). МОПР была створана 30 лістапада 1922 г. на IV кангрэсе Камуністычнага Інтэрнацыянала. На V кангрэсе Камінтэрна былі вызначаны структура і задачы арганізацыі. «МОПР, – зазначалася ў рэзалюцыі кангрэса, – з'яўляецца арганізацыяй пазапартыйнай і ставіць сваёй задачай юрыдычную, маральную і матэрыяльную дапамогу зняволеным барацьбітам рэвалюцыі, іх сем'ям і дзецям, а таксама сем'ям загінуўшых таварышаў» [1, с. 332]. У жніўні 1922 г. пры польскім бюро ЦК РКП(б) была створана камісія дапамогі палітзняволеным у Польшчы, якая пазней, пасля арганізацыі МОПР, стала функцыянаваць у якасці адной з яе міжнародных секцый і называлася «Чырвоная дапамога». З першага дня заснавання польская секцыя МОПР знаходзілася на нелегальным становішчы. У 1925 г. пасля стварэння КПЗБ быў заснаваны МОПР Заходняй Беларусі (пад кіраўніцтвам КПЗБ) як аўтаномная частка агульнапольскай мопраўскай арганізацыі [8, с. 106]. Вярхоўным органам кіравання з'яўляўся агульнакраёвы з'езд, які выбіраў Цэнтральны Камітэт. На месцах дзейнічалі акруговыя і раённыя камітэты, а нізавымі арганізацыйнымі адзінкамі былі ячэйкі МОПР [7, с. 47]. У 1934 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі функцыянавала пяць акруговых камітэтаў МОПР (Беластоцкі, Віленскі, Слонімскі, Пінскі і Маладзечанскі), пяць гарадскіх і адзінаццаць раённых камітэтаў [8, с. 107].

Члены гурткоў МОПР збіралі сярод працоўных харчы, адзенне і грошы для палітзняволеных, дапамагалі сем'ям арыштаваных, арганізоўвалі кампаніі салідарнасці ў падтрымку іх барацьбы [2, с. 165; 8, с. 107]. У гарадах МОПР часта арганізоўваў спецыяльныя групы, якія абыходзілі працоўныя кварталы і збіралі прадукты для палітвязняў [3, с. 14]. Мопраўскія арганізацыі мелі цесную сувязь з турмамі ў Беластоку, Вільні, Брэсце, Ваўкавыску. Акружныя арганізацыі МОПР устанаўлівалі шэфства над турмамі, размешчанымі на тэрыторыі іх акруг. Шэфы пасылалі сваім палітвязням прадукты харчавання, адзенне, бялізну, кнігі, газеты. На тэрыторыі Заходняй Беларусі шэфская праца была асабліва распаўсюджана ў вёсцы. Галоўнай яе формай быў збор прадуктаў і адпраўка іх у турмы. Аб памерах дапамогі можна меркаваць па наступных дадзеных. На працягу кастрычніка – лістапада 1924 г. ячэйкі МОПР у Заходняй Беларусі сабралі на карысць палітвязняў больш за 2 000 злотых [14, с. 81]. У жніўні 1925 г. МОПР Заходняй Беларусі аказаў дапамогу 922 палітвязням у турмах і 100 сем'ям [4, с.14].

Патранаты над палітвязнямі Заходняй Беларусі заснавалі мопраўскія арганізацыі ў Францыі, Канадзе, Аргенціне, ЗША і іншых краінах. У гарадах ЗША (Бостане, Дэтройце, Нью-Йорку, Філадэльфіі і інш.) пачалі ствараццa Беларускія народныя таварыствы, якія былі звязаны з мопраўскімі арганізацыямі [6, с.135]

У сваёй дзейнасці МОПР Заходняй Беларусі карыстаўся пастаяннай падтрымкай МОПР БССР і СССР. Праз МОПР БССР было ўстаноўлена шэфства працоўных калек-

тываў герадоў і вёсак БССР над палітвязнямі ў турмах Заходняй Беларусі. 26 студзеня 1937 г. ЦК МОПР БССР пераваў ЦК МОПР СССР 4 300 руб. для падшэфных турмаў Заходняй Беларусі і Польшчы. Збор сродкаў праходзіў у розных формах: членскія ўзносы, добраахвотныя ахвяраванні, адлікі 1–2% ад заробку, латарэі. правядзеннне інтэрнацыянальных суботнікаў і інш. [9, с.59].

Такім чынам. дапамога савецкіх рэспублік, якая ажыццяўлялася праз МОПР і пад кіраўніцтвам камуністычных партый, адбывалася нелегальна, мела выразна палітычны характар. суправаджалася распаўсюджваннем камуністычных лозунгаў, з'яўлялася сродкам згуртавання шырокіх мас насельніцтва ў барацьбе супраць польскіх улад.


1. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР: док.и материалы: в 2 т / Ин-т истории партии при ЦК КПБ, Фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС, Ин-т истории Акад. Наук БССР, Арх. Упр. при Совете Министров БССР. – Минск: Госиздат, 1962. – Т. 1: 1921-1929 / В.И. Жигалов (сост.) [и др ]. – 620 с.
2. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР: док. и материалы: в 2 т. / Ин-т истории партии при ЦК КПБ, Фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС, Ин-т истории Акад. Наук БССР, Арх. Упр. при Совете Министров БССР. – Минск: Беларусь, 1972. – Т. 2: 1929–1939 / И.П. Ховратович (сост.) [и др.]. – 560 с
3. Глинская, Т.Ю. КПЗБ – руководитель освободительной борьбы трудящихся Западной Белоруссии (1924–1928 гг.) / Т.Ю. Глинская. – Минск. Беларусь, 1965. – 199 с.
4 Гойдь, Т.А. Руководство КПЗБ деятельностью МОПРа в Западной Белоруссии по оказанию материальной помощи политзаключённым и их семьям / Т.А. Гойдь // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3, Гісторыя. Філасофія. Навуковы камунізм. Эканоміка. Права. – 1981. – № 2. – С. 13–15.
5. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 2664.
6. Кіпель, В. Беларусы ў ЗША / В. Кіпель. – Мінск : Беларусь, 1993. – 348 с.
7. Клейн, Б.С. За дело правое: Борьба КПЗБ с буржуазным террором (1920–1938 гг.) / Б.С. Клейн. – Минск: Беларусь, 1986. – 173 с.
8. Ладысеў, У.Ф. КПЗБ – арганізатар барацьбы працоўных за дэмакратычныя правы і свабоды (1934–1938 гг.) / У.Ф. Ладысеў. – Мінск: Выдавецтва БДУ імя У.І. Леніна, 1976. – 168 с.
9. Лугачова, Т.А. Дзейнасць МОПРа па аказанню дапамоги рэвалюцыянерам Заходняй Беларусі / Т.А. Лугачова // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. грамад. навук. – 1988. – № 4. – С. 54–61.
10. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 4п. – Воп. 21. – Спр. 117.
11. НАРБ. – Фонд 103. – Воп. 1. – Спр. 304.
12. НАРБ. – Фонд 242п. – Воп. 1. – Спр. 128.
13. Наша Воля. – 1927. – 9 сакавіка. – С. 1.
14. Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921–1939 гг.) / под ред. А.Н. Мацко [и др.]. – Минск: Беларусь, 1966. – 397 с.



**Посохина Г.И.** (Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина)


## СССР И СТРАНЫ СРЕДНЕГО И БЛИЖНЕГО ВОСТОКА В МЕЖВОЕННЫЙ ПЕРИОД

После победы Октябрьской революции В.И. Ленин продолжил разработку своего учения по национально-колониальному вопросу, обосновывая стратегию и тактику национально-освободительной войны в новых исторических условиях, когда на международной арене появилось первое в мире пролетарское государство. В «Тезисах ко II конгрессу Коммунистического Интернационала» Ленин писал: «Мировая политическая обстановка поставила теперь на очередь дня диктатуру пролетариата, и все события мировой политики сосредоточиваются неизбежно вокруг одного центрального пункта, именно: борьбы всемирной буржуазии против Советской Российской республики, которая группирует вокруг себя неминуемо, с одной стороны, советские движения передовых рабочих всех стран, с другой